**САЮ́З ПРАДПРЫМА́ЛЬНІКАЎ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ**, Беларускі саюз прадпрымальнікаў, грамадская некамерцыйная арганізацыя. Створаны ў 1991. Уключае (1995) каля 500 праваздзейных (акц. т-вы, малыя прадпрыемствы, вытв. і камерц. фірмы, кааператывы і г.д.) і больш за 15 тыс. асацыіраваных членаў.

Мэты саюза: прадстаўленне інтарэсаў прадпрымальнікаў у вышэйшых заканадаўчых, выканаўчых і судовых органах, органах мясц. самакіравання; інфармацыйна-даведачнае абслугоўванне; юрыд. паслугі і прававая ахова; рэклама прадпрыемстваў і іх прадукцыі; стварэнне рабочых месцаў і дадатковых крыніц фарміравання бюджэту; залучэнне замежных інвестыцый у эканоміку рэспублікі. Створаны (1992) Бел. фонд фін. падтрымкі прадпрымальнікаў.

**«САЮ́З РУ́СКАГА НАРО́ДА»** («СРН»), грамадска-паліт. арг-цыя чарнасоценнага кірунку ў Рас. імперыі ў 1906—17. Выступала за адзінства і непадзельнасць Рас. імперыі, у абарону самадзяржаўя з пазіцый вялікадзярж. шавінізму і антысемітызму. Аб'ядноўвала буйных домаўласнікаў, чыноўнікаў, памешчыкаў, купцоў, частку рабочых, сялян, правасл. духавенства. На Беларусі арг-цыі «СРН» існавалі ва ўсіх губ. і пав. гарадах, мястэчках, вялі ўзмоцненую барацьбу супраць палякаў і яўрэяў, бел. нац. руху і яго газ. «Наша ніва». Гал. орган — газ. «Минское слово». Ініцыятар стварэння *«Рускага ўскраіннага саюза»*. *М.М.Забаўскі.*



Талерка, зробленая на **Свержанскай фаянсавай мануфактуры**.



**Светлагорск**. Забудова мікрараёна Паўднёвы.

**САЮ́З ТЭАТРА́ЛЬНЫХ ДЗЕ́ЯЧАЎ БЕЛАРУ́СІ**, добраахвотная грамадская творчая арг-цыя работнікаў тэатр. мастацтва. Створаны ў 1987 з Бел. тэатр. аб'яднання (да 1992 у складзе Саюза тэатр. дзеячаў СССР). Аб'ядноўвае (1995) больш за 1310 членаў. Мэта саюза — садзейнічанне развіццю бел. сцэнічнага мастацтва.

**САЮ́З ЭКАНАМІСТАЎ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ**, добраахвотнае творчае аб'яднанне эканамістаў прадпрыемстваў і ўстаноў, органаў дзярж. кіравання, навук. работнікаў, студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спец. устаноў эканам. профілю. Створана ў 1991 на базе Бел. рэспубліканскага праўлення б. Усесаюзнага эканам. т-ва. Аб'ядноўвае (1995) каля 30 тыс. членаў.

Мэты — садзейнічанне правядзенню эканам. рэформ, станаўленню і развіццю рынначных адносін на Беларусі, ажыццяўленне мер па ахове прафес. правоў і забеспячэнні сац. патрэб яго членаў. У абл. цэнтрах пры рэгіянальных аддзяленнях створаны творчыя калектывы, малыя прадпрыемствы, цэнтры навук.-тэхн. паслуг, кансультацыйныя пункты, асацыяцыі. З 1991 уваходзіць у Міжнар. саюз эканамістаў.

**СВАБО́ДНАЯ ЭКАНАМІ́ЧНАЯ ЗО́НА** (СЭЗ), частка тэр. краіны, на якой ствараюцца асобыя эканам. і юрыд. ўмовы, ільготны падатковы і мытны рэжым для прадпрымальніцкай дзейнасці. Іх мэта — стымуляваць развіццё пэўнага рэгіёна ці асобных сфер эканомікі. Беларусь займае выгаднае эканоміка-геагр. і геапаліт. становішча, мае высокі навук.-вытв. патэнцыял, кваліфікаваныя кадры, што стварае неабходныя перадумовы для СЭЗ. Асабліва вылучаюцца Брэст і Гродна. Урад Беларусі ўхваліў часовае палажэнне аб СЭЗ у раёне Брэста, якая займае пл. 10 км². Аўтамаб. пагранпераход каля буйной аўтамаб. і чыг. магістралі Парыж—Масква—Пекін, аэрапорт міжнар. класа разам з развітым прамысл. патэнцыялам далі магчымасць для арганізацыі дзярж. прадпрыемства бізнес-цэнтр СЭЗ «Брэст». Адной з форм СЭЗ і залучэння замежных інвестыцый у эканоміку рэспублікі з'яўляецца стварэнне тэхнапаркаў і тэхнаполісаў — міжгаліновых навук.-тэхнал. комплексаў, у якія ўваходзяць навукаёмістыя фірмы, даследчыя лабараторыі, пасрэдніцкія фірмы навукаёмістых паслуг (усе яны групуюцца вакол буйнога ун-та ці даследчага цэнтра). *А.У.Багдановіч.*

**СВАЯ́К** Казімір (сапр. Стаповіч Канстанцін; 19.2.1890, в. Барані Астравецкага р-на — 6.5.1926), бел. паэт, прадстаўнік клерыкальнага рамантызму. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1914). Служыў ксяндзом, у сваёй парафіі адкрываў бел. школы. Аўтар зб. вершаў «Мая ліра» (1924), п'ес «Янка Канцавы» (1920), «Купалле» (1930), публіцыст. трактата пра шкоднасць п'янства «Алкаголь» (1913), дзённіка «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі» (1932). Яго вершы экспрэсіўныя, медытацыйныя, адметныя біблейскай сімволікай, малітоўна-псалмавай стылістыкай, выкарыстаннем фальклору.

**СВЕ́ДКІ ІЕГО́ВЫ**, рэлігійная арг-цыя пратэстанцкага кірунку. Узнікла ў 1870-я г. ў ЗША у выніку аддзялення ад *адвентыстаў*. Да 1931 наз. «Даследчыкі Бібліі». На тэр. Беларусі місіянерская дзейнасць С.І. пачалася ў 1920-я г. У 1925 зафіксавана т-ва «Даследчыкаў свяшчэннага пісання» ў Брэсцкім пав. У 1995 на Беларусі дзейнічала 6 абшчын С.І.

С.І. адмаўляюць бессмяротнасць душы, верацъ у існаванне пекла і раю, гал. членам Тройцы лічаць Іегову («бога-бацьку»). Гісторыю грамадства разглядаюць як барацьбу паміж Іеговай і Сатаной, якая хутка закончыцца бітвай (армагедонам). Асн. задача С.І. — місіянерская дзейнасць.

**СВЕ́РЖАНСКАЯ ФАЯ́НСАВАЯ МАНУФАКТУ́РА**. Існавала ў 1742—60 у мяст. Свержань (Стаўбцоўскі р-н). Заснаваў уладальнік мястэчка кн. М.Радзівіл. На мануфактуры выраблялі пераважна сталовы і аптэчны посуд, а таксама дэкар. куфэркі, шкатулкі, літургічны посуд, фігуры святых да алтароў, бюсты стараж. філосафаў для інтэр'ера б-кі Радзівілаў у Нясвіжскім замку, фаянсавыя белыя і зялёныя пячныя пліткі і інш. Традыцыі зах.-еўрап. (саксонскага) фаянсу набылі характэрную мясц. інтэрпрэтацыю; у вырабах адчуваецца ўплыў позняга барока. Узораў С.ф.м. захавалася вельмі мала. *Я.М.Сахута.*

**СВЕТЛАГО́РСК**, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Светлагорскага р-на, прыстань на р. Бярэзіна. За 100 км ад Гомеля. Чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне на лініі Жлобін—Калінкавічы, на